Источник: "Звязда" - 2014-07-09

Даты Падзеі Людзі

**1762** год — Пётр III падпісаў маніфест аб адрачэнні ад прастола. У выніку перавароту імператрыцай была абвешчана Кацярына II. А Пётр у суправаджэнні варты гвардзейцаў быў адпраўлены ў Ропшу за 30 вёрст ад Пецярбурга, дзе і загінуў пры нявысветленых абставінах. Паводле афіцыйнай версіі, прычынай смерці імператара быў прыступ гемарою, узмоцнены ад працяглага ўжывання алкаголю. Па іншай версіі, Пётр быў ці то наўмысна, ці то выпадкова (падчас бойкі) забіты гвардзейцамі, якія яго ахоўвалі. Існуе таксама меркаванне, што ён памёр ад інсульту, выкліканага шокам. Новай імператрыцы з гатоўнасцю прысягалі не толькі палкі гвардыі, але і Сенат, і Сінод. Немка Кацярына з гадамі стала рускай патрыёткай, паверыла ў богаабранасць рускага народа і яго асаблівую місію. У аснове імперскай свядомасці ляжала перакананасць у праве Расіі — спадчынніцы Візантыі — распараджацца лёсамі іншых народаў. «Прынамсі, параўноўваючы ўсе вядомыя нам часы Расіі, ледзь ці не кожны з нас скажа, што час Кацярыны быў шчаслівым для грамадзяніна расійскага, — пісаў Карамзін. — Ці не кожны з нас жадаў бы жыць тады, а не ў іншы час». «Мяне абкрадаюць гэтак жа, як і іншых, — скардзілася імператрыца ў лісце да спадарыні Б'елке ў 1775 годзе, — але гэта добры знак, які паказвае: у нас ёсць што красці».



**1884** год — нарадзіўся (вёска Яновічы, цяпер Віцебскі раён) Міхаіл Маркавіч Барадзін, рэвалюцыянер, савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч. У рэвалюцыйным руху з 1900 года, удзельнік рэвалюцыі 1905-1907 гг. З 1907-га — у ЗША: член Сацыялістычнай партыі ЗША, Таварыства дапамогі рускім палітвязням. З 1918 года, вярнуўшыся ў Савецкую Расію, працуе ў Наркамаце замежных спраў РСФСР і Камінтэрне, пасол РСФСР у Мексіцы. З 1927 года — намеснік наркама працы, намеснік дырэктара ТАСС, затым — галоўны рэдактар газеты Moscow News («Московские новости»), адначасова, у 1941-1949 гг., — рэдактар Саўінфармбюро. У 1951 годзе рэпрэсаваны. Рэабілітаваны пасмяротна.

**1912** год — нарадзіўся (вёска Каласоўшчына, цяпер Капыльскі раён) Сяргей Астрэйка, беларускі паэт. Працаваў літаратурным рэдактарам у Беларускім НДІ прамысловасці, з 1932 года — у Камісіі па складанні слоўнікаў Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН Беларусі. Вершы пачаў пісаць падчас вучобы ў сямігодцы. У 1928 годзе па рэкамендацыі Ц. Гартнага вершы С. Астрэйкі з'явіліся ў газеце «Чырвоная змена». Яго паэму «Бенгалія» ўхваліў Я. Купала. Аўтар рамантычнай паэмы «Смарагды кроз». У 1933 годзе арыштаваны і сасланы ў Свярдлоўскую вобласць. У ссылцы зрабіў пераклад «Яўгена Анегіна» А. Пушкіна, рукапіс не захаваўся. Тэрмін ссылкі яшчэ не скончыўся, калі 14 жніўня 1937 года паэта зноў арыштавалі, праз месяц быў вынесены смяротны прысуд, на наступны дзень (14.9.1937) С. Астрэйку расстралялі. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

## Было сказана

**Марк ТВЕН, пісьменнік:**

***«Чалавек — адзіная жывёліна, здольная чырванець. Зрэшты, толькі яму і даводзіцца чырванець».***